Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 108 (28218) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Місія – тата**



**Развіваем мозг па японскай методыцы**



**Расклад Еўра-2016**

СТАР. 15

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЎРОКІ ІНТЭГРАЦЫІ

**Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — мерапрыемства значнае, статуснае. Аб гэтым кожны раз сведчаць і падпісаныя кантракты, і дагаворы, і прысутнасць на Форуме лідараў абедзвюх дзяржаў.**



Фота БЕЛТА.

Трэці, мінскі форум, не стаў выключэннем. Учора ў беларускую сталіцу прыляцеў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. Перад тым, як накіравацца на пленарнае пасяджэнне ў Палац Рэспублікі, кіраўнікі нашых краін правялі сустрэчу, дзе абмеркавалі беларуска-расійскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, іншыя актуальныя пытанні двухбаковых адносін.

Перамовы кіраўнікоў дзяржаў прайшлі спачатку ў фармаце «сам-насам». Затым адбылася сустрэча ў пашыраным складзе з удзелам членаў урадаў і іншых афіцыйных асоб з кожнага боку.

«У міжрэгіянальным супрацоўніцтве засяроджаны велізарны патэнцыял, які можа паскорыць тэмпы аднаўлення аб'ёмаў узаемнага тавараабароту Беларусі і Расіі. Мы ж, абмяркоўваючы праблемы на вышэйшым узроўні, павінны паказаць рэгіянальнай вертыкалі прыклад канструктыўнага і выніковага супрацоўніцтва. Мы вызначаем вектар нашага руху на вышэйшым узроўні», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар канстатаваў, што бакам пакуль не ўдалося пераламаць негатыўную дынаміку тавараабароту. «Але, што радуе, дзякуючы нашым скаардынаваным намаганням ў пераадоленні наступстваў эканамічнай нестабільнасці ў свеце тэмпы падзення тавараабароту значна замарудзіліся. Калі па выніках чатырох месяцаў мінулага года ўзаемны тавараабарот упаў на 30%, то сёлета зніжэнне склала каля 12%, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Спадзяюся, што ў ходзе сумеснай працы мы зможам адшукаць рэзервы для замацавання станоўчай тэндэнцыі».

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Супрацоўніцтва паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі стала рэальнай рухаючай сілай, якая напаўняе канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы. Разгляд практычных пытанняў супрацоўніцтва з прыцягненнем рэгіёнаў і суб'ектаў гаспадарання дазваляе ажыццяўляць свайго роду маніторынг і выяўляць праблемы, якія ўзнікаюць пры рэалізацыі рашэнняў, што прымаюцца ў інтэграцыйных аб'яднаннях, збліжаць пазіцыі пры пошуку шляхоў іх вырашэння».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 19807,00 ▼ |
| Еўра | 22523,00 ▼ |
| Рас. руб. | 306,42 ▲ |
| Укр. грыўня | 793,87 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## ГРАФІЦІ ДРУЖБЫ




Фота Надзеі БУЖАН.

**Графіці дружбы Беларусі і Расіі з'явілася на мінскім жылым доме па вуліцы Магілёўскай. Малюнак зроблены ў якасці падарунка жыхарам сталіцы да дзён Масквы ў Мінску.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!